■ Выбары-2015

# ТРЫ ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ ГРУПЫ

**Учора ў Цэнтральную камісію Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў былі пададзеныя дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні Калякіна Сяргея Іванавіча і Гайдукевіча Сяргея Васільевіча кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Кіраўнік першай ініцыятыўнай групы — Валерый Пятровіч Ухналёў, другой — Анатоль Пятровіч Хішчэнка.**

Такім чынам, як паведамляе афіцыйны сайт Цэнтрвыбаркама, на вечар серады ў ЦВК пададзеныя заявы трох асоб, якія маюць намер удзельнічаць у выбарах у якасці кандыдатаў: дзеючага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, кіраўніка Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Сяргея Калякіна і старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП) Сяргея Гайдукевіча. Для Аляксандра Лукашэнкі гэта пятая па ліку выбарчая кампанія, чатыры папярэднія былі для яго пераможныя. Сяргей Калякін удзельнічаў у прэзідэнцкіх выбарах у якасці прэтэндэнта на пост кіраўніка дзяржавы ў 2001 годзе, але яго ініцыятыўная група тады не набрала неабходнай для рэгістрацыі кандыдатам колькасці подпісаў. Сяргей Гайдукевіч удзельнічаў у трох прэзідэнцкіх кампаніях: 2001, 2006 і 2010 гадоў. У 2001-м за яго прагаласавала 2,48% выбаршчыкаў, у 2006-м — 3,5%. У 2010 годзе ён зняў сваю кандыдатуру на этапе збору подпісаў.

# ЕЎРАПЕЙСКАЯ МІСІЯ НАВЕДАЛА ЦЭНТРВЫБАРКАМ

**У сераду старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына і сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай Лазавік сустрэліся з прадстаўнікамі ацэначнай місіі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ) і дырэктарам па пытаннях выбараў Парламенцкай асамблеі АБСЕ Андрэасам Бэйкерам.**

На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні міжнароднага назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2015 годзе. Мікалай Лазавік, каментуючы вынікі сустрэчы, заўважыў: «Была выказана ўдзячнасць, што Рэспубліка Беларусь запрасіла місію для назірання за выбарамі. Гэтым запрашэннем яна абавязкова скарыстаецца».

Кіраўніцтва ЦВК Беларусі азнаёміла місію з тым, як праходзіць падрыхтоўка да выбараў. «Было адзначана, што работа вядзецца ў адпаведнасці з каляндарным планам. Цяпер ідзе этап падачы дакументаў для рэгістрацыі ініцыятыўных груп патэнцыяльных кандыдатаў і фарміраванне тэрытарыяльных камісій», — сказаў Мікалай Лазавік. Ён падкрэсліў, што ЦВК нацэльвае камісіі на месцах на тое, каб кампанія праходзіла свабодна, дэмакратычна і без лішніх абмежаванняў і забарон. «У час семінараў, у ходзе маючых адбыцца трэнінгаў членаў выбарчых камісій будзем акцэнтаваць увагу на тым, каб адносіны ўсіх суб'ектаў выбарчага працэсу — і палітычных партый, і грамадскіх аб'яднанняў, і кандыдатаў, і давераных асоб, і членаў камісій, і назіральнікаў — былі ўважлівымі і не выходзілі за рамкі заканадаўства», — дадаў Мікалай Лазавік.

Ацэначную місію БДІПЧ АБСЕ, якую прадстаўлялі старшы саветнік па выбарах Таццяна Багусевіч і саветнік дэпартамента па выбарах Уладзімір Місеў, цікавіла сістэма выбарчых камісій: склад ЦВК, парадак яе фарміравання, колькасць тэрытарыяльных і ўчастковых выбаркамаў і іншае. «Асаблівую ўвагу яны звярнулі на нядаўнія змяненні выбарчага заканадаўства. У прыватнасці іх цікавіла такая норма, як фарміраванне фондаў кандыдатаў. Які парадак фарміравання, як ажыццяўляецца кантроль за выкарыстаннем фінансаў», — растлумачыў сакратар ЦВК. Удзельнікі місіі задалі і многія іншыя пытанні, у тым ліку пацікавіліся, ці выконваецца норма, згодна з якой адна трэць камісій павінна складацца з прадстаўнікоў партый і грамадскіх аб'яднанняў. «Гэтая норма ў нас выконваецца паўсюль, нават у самых аддаленых сельскіх населеных пунктах. Калі там няма нейкіх палітычных партый, то маладзёжныя, прафсаюзныя, ветэранскія арганізацыі там дзейнічаюць», — адзначыў Мікалай Лазавік.

Акрамя таго, размова ішла аб забароне агітацыі, накіраванай на байкот выбараў. Сакратар ЦВК нагадаў прадстаўнікам місіі, што Беларусь далучылася да Канвенцыі аб стандартах дэмакратычных выбараў, выбарчых правоў і свабод дзяржаў — удзельніц СНД. «У адпаведнасці з гэтай канвенцыяй байкот забаронены. Прычым гэтая забарона распаўсюджваецца не толькі на выступленні кандыдатаў, але і на ўсіх грамадзян краіны. Інакш кажучы, калі дзяржава траціць вялізныя грошы на арганізацыю і падрыхтоўку выбараў, то грамадзянам забараняецца весці агітацыю за зрыў гэтага найважнейшага мерапрыемства», — сказаў Мікалай Лазавік.

Ацэначная місія БДІПЧ АБСЕ будзе знаходзіцца ў Беларусі да 17 ліпеня.

# СТАЛІЦА ВЫЗНАЧЫЛАСЯ З ПІКЕТАМІ

**У Мінску вызначаны месцы, забароненыя для правядзення пікетавання з мэтай збору подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Гэтае рашэнне Мінгарвыканкама ўступае ў сілу з 23 ліпеня і дзейнічае да 21 жніўня 2015 года ўключна, пра што паведамляе прэс-служба сталічнай мэрыі.**

Пікетаванне забаронена на аб'ектах метрапалітэна, чыгуначнага і паветранага транспарту, у падземных пешаходных пераходах; на тэрыторыі Кастрычніцкай плошчы, плошчы Незалежнасці, плошчы Перамогі, плошчы Дзяржаўнага сцяга, Прывакзальнай плошчы, плошчы Якуба Коласа; на адлегласці менш як 200 м ад будынкаў рэзідэнцыі Прэзідэнта, Нацыянальнага сходу, Савета Міністраў; на адлегласці менш як 50 м ад будынкаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых прадстаўнічых, выканаўчых і распарадчых органаў, дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў, судоў, органаў пракуратуры, тэрыторый арганізацый, якія забяспечваюць абараназдольнасць і бяспеку дзяржавы.

Устаноўлена, што пікетаванне з мэтай збору подпісаў выбаршчыкаў можа праводзіцца з 8.00 да 22.00.

Галоўнаму ўпраўленню ўнутраных спраў Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта даручана забяспечыць ахову грамадскага парадку ў Мінску ў час збору подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

# ВОЗЬМУЦЦА ЗА ПАДРАДЧЫКАЎ

**«Калі ў дачыненні да найбуйнейшых прамысловых прадпрыемстваў прыняты меры, што накіраваны на стабілізацыю фінансава-эканамічнага становішча, то ў дачыненні да падрадных арганізацый прапаноў па вырашэнні існуючых праблемных пытанняў пакуль няма», — адзначыў учора на пасяджэнні Савета Міністраў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ.**

У прыватнасці, на пасяджэнні былі заслуханы справаздачы міністра архітэктуры і будаўніцтва, старшыняў аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама аб выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы і ўрада па павышэнні эфектыўнасці работы падрадных арганізацый, домабудаўнічых камбінатаў і арганізацый вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Прэм'ер-міністр заўважыў, што ў будаўнічай галіны маецца значная колькасць негатыўных тэндэнцый, якія сёлета толькі пагаршаюцца. Паводле яго слоў, ва ўмовах скарачэння інвестыцыйнай актыўнасці і аб'ёмаў будаўніцтва, высокай закрэдытаванасці арганізацый востра стаць пытанні выкарыстання створаных і мадэрнізаваных вытворчых магутнасцей будаўнічага комплексу. Андрэй Кабякоў заклікаў членаў урада прааналізаваць існуючыя праблемныя пытанні і падрыхтаваць канкрэтныя прапановы па выхадзе з сітуацыі.

На гэтым пасяджэнні **міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль ЧОРНЫ** паведаміў, што ў нашай краіне кошт квадратнага метра жылля для чаргавікоў не перавышае ўзровень сярэдняй зарплаты з каэфіцыентам 1,2. Ён адзначыў, што цяпер на жыллі з дзяржпадтрымкай гэты каэфіцыент складае 1,08, па астатнім — 1,13. Акрамя гэтага, індэкс будаўніча-мантажных работ сёння амаль на 10% ніжэйшы за індэкс спажывецкіх цэн. «Мы ўзялі на сябе абавязацельствы не дапусціць росту коштаў і будзем утрымліваць будаўнічы комплекс у гэтых межах да канца года», — паабяцаў міністр.

Кіраўнік галіны нагадаў, што летась была завершана мадэрнізацыя домабудаўнічых камбінатаў, пасля чаго прырост вытворчых магутнасцей падвоіўся і склаў 2,440 млн кв.м у год. За 5 месяцаў года выручка арганізацый ад рэалізацыі прадукцыі павялічылася ў 1,3 раза, рэнтабельнасць продажаў вырасла на 3,3%, а чысты прыбытак — у 2,5 раза. «Комплексны падыход да мадэрнізацыі дазволіў аптымізаваць затратную частку і гэтым знізіць кошт квадратнага метра», — растлумачыў Анатоль Чорны. Міністр упэўнены, што сітуацыя ў будаўніцтве жылля пры сённяшняй загрузцы прадпрыемстваў дае магчымасць працаваць рэнтабельна і прыбыткова.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Супрацоўніцтва

# ДАЙСЦІ ДА ПЯЦІСОТ

**Намеснік міністра эканомікі Малдовы Актавіян КАЛМЫК прагназуе павелічэнне тавараабароту паміж яго краінай і Беларуссю да 500 млн долараў, «калі не ў бягучым, то ў 2016 годзе». Пра гэта ён заявіў учора на пасяджэнні Міжурадавай беларуска-малдаўскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ў Мінску.**

«Нас радуе той факт, што Беларусь, нягледзячы на ўсю кан'юнктуру, якая існуе ў рэгіёне, не прымяняе ніякіх абмежаванняў, тарыфных або нетарыфных бар'ераў у адносінах да малдаўскіх тавараў. Наадварот — прапануе рашэнні па развіцці адносін паміж рознымі гаспадарчымі суб'ектамі», — адзначыў Актавіян Калмык.

Неабходнасць выхаду на больш плённае супрацоўніцтва і павелічэнне аб'ёмаў узаемнага гандлю паміж дзвюма краінамі падтрымаў і **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіл РУСЫ**, які ўзначальвае беларускую частку міжурадкамісіі. Ён звярнуў увагу на тое, што калі за апошнія пяць гадоў тавараабарот паміж Беларуссю і Малдовай вырас практычна ўдвая і перасягнуў у 2014 годзе мяжу ў 400 млн долараў, то пяць месяцаў 2015-га дэманструюць некаторую «прабуксоўку». На думку віцэ-прэм'ера, бакам неабходна актывізавацца, прапрацаваць усе вузкія месцы, каб па выніках бягучага года мець тавараабарот хаця б не ніжэйшы за 420-440 млн.

Пра актывізацыю эканамічнага супрацоўніцтва сёння будуць размаўляць і лідары дзвюх краін. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правядзе перамовы з Прэзідэнтам Малдовы Мікалаем Цімафці, які прыбывае ў Беларусь з афіцыйным візітам.

А вось практычны бок узаемаадносін абмяркуюць на беларуска-малдаўскім бізнес-форуме. Удзел у ім возьмуць каля 20 кампаній з Малдовы — з вінаробнай галіны, аграхарчовай прамысловасці, дыстрыб'ютары сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання, будматэрыялаў і іншыя.

**Паводле БЕЛТА**

# ГРОДНА — ПАГРАНПЕРАХОД — ДРУСКІНІНКАЙ

**Такім будзе маршрут ужо пятага па ліку міжнароднага марафону дружбы, які яднае суседнія гарады Беларусі і Літвы.**

Заяўкі на пераадоленне класічнай марафонскай дыстанцыі працягласцю 42 кіламетры 195 метраў, якая сертыфікавана Міжнароднай федэрацыяй лёгкай атлетыкі, падалі ўжо больш за 240 спартсменаў з 15 краін. Прайшоўшы пагранічны і мытны кантроль у часовай зоне, яны стартуюць раніцай 19 ліпеня каля Лядовага палаца спорту ў Гродне, прабягуць па вуліцах горада і накіруюцца ў бок пагранічнага перахода «Прывалка-Райгардас». Фініш — у цэнтры Друскінінкая.

Удзельнікі марафону падзелены на чатыры ўзроставыя групы — ад 18 да 80 гадоў. Зарэгістраваліся, напрыклад, Юген Кухімей з Германіі (1938 года нараджэння), Пётр Сілкін з Літвы (1941 г.н.) і Тэнка Лаўры з Фінляндыі (1945 г.н.). Верхні ліміт часу на пераадоленне трасы — 6 гадзін, пасля чаго вынікі бегуноў фіксавацца не будуць. Для параўнання: вынікі мінулагодніх пераможцаў, нашага земляка Сцяпана Рагаўцова і Крысціны Багамягкавай з Украіны, — адпаведна 2 гадзіны 28 хвілін 31 секунда і 3 гадзіны 3 хвіліны 52 секунды.

Усе ўдзельнікі марафону, якія дасягнуць фінішу на працягу кантрольнага часу, атрымаюць медалі. А тых, хто зойме 1-6-е месцы ў абсалютным першынстве сярод мужчын і жанчын, чакаюць грашовыя прэміі. За 1-3-е месцы ва ўсіх узроставых групах узнагародзяць каштоўнымі прызамі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Сітуацыя

# «ДАБРАНОМ» ВЫКРУЦІЎСЯ?

## Мінгандлю прызначыла гэтай сетцы кантрольную праверку і гатовы выслухаць скаргі пастаўшчыкоў

**Не вельмі радасна, калі за нейкія парушэнні часова зачыняюць адну невялікую краму. Зусім іншая справа, калі збіраюцца спыніць дзейнасць усёй вялікай сеткі, дзе больш за сотню магазінаў. Менавіта за даўгі перад пастаўшчыкамі адразу 177 крам сеткі «Дабраном» маглі трапіць у чорны спіс ужо з 21 ліпеня.**

Кіраўніцтва гандлёвай сеткі адрэагавала аператыўна і ўжо 14 ліпеня аб'явіла аб поўным пагашэнні пратэрмінаванай запазычанасці перад пастаўшчыкамі за кошт выручкі сваіх крам. Цяпер адміністрацыя гэтай вядомай сеткі спадзяецца, што Мінгандлю адменіць рашэнне аб прыпыненні дзейнасці ўсіх іх крам у трэцяй дэкадзе ліпеня. У Міністэрстве гандлю працуюць зусім не крыважэрныя людзі, таму там часткова пайшлі насустрач і прызначылі кантрольную праверку ліквідацыі парушэнняў, у тым ліку ў часткі забеспячэння своечасовасці разлікаў. Мінгандлю таксама прапанавала пастаўшчыкам тавараў у «Дабраном» пры наяўнасці фактаў пратэрмінаванай запазычанасці паведаміць да 17 ліпеня ў міністэрства па тэлефоне (017) 327-25-97 з прадстаўленнем пацвярджальных дакументаў.

Прадстаўнікі органаў дзяржкіравання адзначаюць, што настойлівая пазіцыя Мінгандлю дазваляе зняць вастрыню праблемы разлікаў гандлёвых сетак з пастаўшчыкамі. **Прадстаўнік «Белдзяржхарчпрама» Міхаіл СВЯНЦІЦКІ**, у прыватнасці, на нядаўняй нарадзе адзначыў: «Калі месяц таму дэбіторская запазычанасць складала больш за 80 млрд рублёў, то цяпер яна скарацілася на 36 млрд, што можна назваць сур'ёзным крокам па вырашэнні гэтай праблемы». Ён заявіў аб недапушчальнасці таго, што сёння на спажывецкім рынку сеткавыя аператары дыктуюць жорсткія ўмовы пастаўшчыкам.

Нагадаю, што на момант папярэдняй праверкі сеткі «Дабраном» пратэрмінаваная запазычанасць арганізацый за пастаўленыя тавары, у тым ліку мяса, малако і хлеб, перавышала 30 млрд рублёў.

**Кіраўнік згаданага прадпрыемства Васіль ЯКУБАЎ** удакладніў, што праблемы з разлікамі маюць кароткачасовы характар. У падобных сітуацыях кампанія раней прыцягвала кароткатэрміновыя банкаўскія крэдыты для пагашэння запазычанасцей. «На момант вынясення рашэння Мінгандлю аб прыпыненні працы ўсіх крам у «Дабранома» была дамоўленасць з 3 банкамі і буйной лізінгавай кампаніяй аб выдзяленні крэдытных сродкаў. Аднак пасля рашэння аб прыпыненні працы сеткі нашы партнёры прыпынілі перамовы аб крэдытаванні да канчатковага рашэння Мінгандлю», — растлумачыў Васіль Якубаў.

У прыватнасці ён паведаміў, што «Дабраном» і без праверкі Мінгандлю абавязкова аплаціў бы ўсе кантракты на пастаўку тавараў. Кіраўнік кампаніі запэўніў, што «ніколі за пяць гадоў працы сеткі не было запазычанасці ні перад бюджэтам, ні па заработнай плаце, ні перад банкамі. Запазычанасць перад пастаўшчыкамі, калі і была, то мела кароткатэрміновы характар».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*